НАВІНЫ СУХАРАВА

№1, травень 2007



ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

О ПОЛИКЛИНИКЕ В СУХАРЕВО

На протяжении последних пяти лет одной из самых острых проблем Сухарево остается отсутствие своей поликлиники. Сегодня практически все жители нашего района на себе ощутили ограниченные способности действующей 2-ой районной поликлиники обслуживать одновременно чуть ли не самые густонаселенные микрорайоны г.Минска – Сухарево, Запад-3 и Красный Бор. Люди заждались реальных действий со стороны городских властей, а не голых обещаний.

Решения о строительстве поликлиники уже неоднократно принимались в чиновничьих кабинетах горисполкома, а воз и ныне там. Более того, принимаемые решения о месте строительства поликлиники в который раз демонстрируют чиновничью некомпетентность и бездушие, поскольку отведенная для строительства поликлиники площадка находится в недопустимой близости к школе № 212, а также жилым домам по улице Сухаревской. Это вызывает справедливое негодование граждан. Но нас никто не слушает и не собирается слушать.

Своими безответственными решениями власти города вводят в заблуждение тысячи людей, которые надеются не проводить в поликлинике по 3 часа после работы в ожидании своей очереди, а заиметь в конце концов отдельную, рассчитанную на качественное обслуживание, свое медицинское учреждение. А если к этому добавить еще и транспортные проблемы для жителей Сухарево-2 и 6 и активно заселямых в новостройки жителей Сухарево-3, то можно с уверенностью сказать, что люди вынуждены выделять значительную часть своего времени (до 4 часов) на то, чтобы получить элементарную диагностику и соответствующй справочный документ о болезни.

Это не может не раздражать людей, которые повсюду только и слышат заклинания государсвенных СМИ о том, что у нас «государство для народа», а в Минске – «новое качество жизни». Лозунги не новые, можно даже сказать основательно заезженные, но что реально стоит за этими словами? Пока что все основания утверждать только одно - НИЧЕГО.

Те же проблемы очередей относятся и к детской поликлинике. Каждое утро у дверей кабинета на сдачу анализа крови собирается огромное количество спешащих на работу взрослых со своими детьми. Претензий к организации приема граждан со стороны поликлиники минимальные, они делают по сути все, что от них зависит, а вот к никуда не спешащим с принятием ответственных решений со стороны администрации района вопросов все больш и больше. Основную напряженность, раздражение и недовольство жителей района вызывают утверждения властей о том, что действующие взрослая и детская поликлииники рассчитаны на оказание медицинской помощи населению численностью 75 тысяч человек. Можно себе представить какой потенциал расчетов еще не задействован районными чиновниками, если попробовать повысить нагрузку на терапевтов, сделав им очередной подарок в виде прикрепления за ними людей из новостроек. Терапевты за ту же зарплату будут обслуживать например не тысячу, а тысячу двести человек. Чиновники за счет одному им известным формулам расчетов получают экономию средств на повышении интенсивности труда терапевта.

При этом о вечно толпящихся под кабинетами взрослых с замлевшими детьми никто думать не собирается, это вопросы даже не второго плана, волнующие белорусского чиновника. Для него главное написать отчет, показать «эффективность» своей работы в «решении проблем людей». Очень человеческий подход, мол я с себя ответственность снял, сделал все что в моих силах: персчитал на калькаляторе свой норматив медицинского обслуживания людей.

К.А.



очередь за талонами в поликнике №2

Дарагія жыхары Сухарава!

Вы трымаеце ў руках першы выпуск “Навінаў Сухарава”, які, супольна з іншымі неабыякавымі жыхарамі нашага мікраранёну, я вырашыў выдаваць.

Навошта?

• Каб інфармаваць грамадзкасць Сухарава пра жыццё, падзеі, і праблемы нашага мікрараёна;

• Каб паставіць на грамадскі кантроль дзейнасць уладаў і прызначаных імі дэпутатаў па гарантаванні законных правоў і інтарэсаў усіх нас, насельнікаў заходняе часткі беларускае сталіцы;

• Каб заахвоціць усіх тых, хто мае актыўную і выразна акрэсленую грамадскую пазіцыю, далучацца да маёй ініцыятывы шляхам сваіх прапановаў, сваіх дopiсаў ды артыкулаў, а таксама дапамогі ў распаўсюдзе “Навінаў Сухарава”.

• І, урэшце, каб паспрыяць вырашэнню надзёных праблемаў, што хвалююць усіх нас, бо пераканаы, што можна шмат чаго дамагчыся, а таксама паўплываць на дзеянні ўладаў, калі нас шмат, мы разам і мы ведаем, чаго мы хочам.

Дарэчы, менавіта таму я браў другі раз удзел у так званых выбарах. Я цудоўна ведаю, што выбараў у Беларусі НЯМА (гл. сайт www.lahviniec.org), а ёсць прызначэнне “канструктыўных” статыстаў, якім найперш карціць пра тое, каб або камфортна жыць на пенсіі, або зрабіць імклівую міністэрскую кар’еру.

14 студзеня 2007 г. выбараў у Сухараве не было, пра што, дарэчы ведае большасць жыхароў Сухарава, бо больш за 60% выбарцаў па Сухараўскай акрузе не пайшлі наагул галасаваць. Іхны недавер да “выбарчай машыны”, аснову якой на мясцовым узроўні складаюць супрацоўнікі сухараўскіх ЖЭСаў ды настаўнікі сухараўскіх школаў, цалкам апраўданы.

У той жа час, я вельмі хачу сказаць “Вялікі дзякуй” усім тым, хто аказаў мне свой давер падчас выбарчай кампаніі – паставіў подпіс за маё вылучэнне, тэлефанаваў са словамі падтрымкі, прагаласаваў падчас выбараў – падтрымка з боку кожнага з Вас вельмі важная для мяне, паколькі яна дадае мне моцы ў маёй дзейнасці на карысць нашага Сухарава і нашай Беларусі. І я вельмі добра адчуваў гэтую падтрымку як падчас, так і пасля “выбараў”.

Менавіта лічу неабходным працаваць далей для Вас і веру, што разам мы зможам дасягнуць поспеху ў нашай супольнай Справе “За лепшае Сухарава!” і “За лепшую Беларусь!”.

Заўседы рады адказаць на Вашыя пытанні, заўвагі і прапановы па наступных тэлефонах (+37529) 606-10-34; (+37529) 509-90-93), а таксама праз e-mail (a_lahviniec@tut.by). Запрашаю таксама наведаць мой сайт у Інтэрнэце: www.lahviniec.org

Аляксандр Лагвінец

ПРА “ПАДЛІК ГАЛАСОЎ” У СУХАРАВЕ

Камісія на ўчастку №8, дзе я назіраў, складалася ў большасьці з работнікаў папраўчай установы “каленія №1” Фрунзенскага раёну Менску. Пару чалавек было ад школы №212, дзе знаходзіўся ўчастак.

Сяроддрэпрэзэнтантаў школы была, дарэчы, намесьніца кіраўніка камісіі - матэматык з адукацыі.

Начальнік, прабачце, старшыня камісіі быў маёр. У складзе камісіі было чацьвёра дужых, але невысокіх хлопцаў, якія сьмела дазвалялі б абыходзіцца без дапамогі міліцыянтаў.

З назіральнікаў ад кандыдатаў быў адзін я. Але побач за назіральніцкім сталом сядзелі два мужчыны 40-47 гадоў прасьцецкага выгляду.

Адзін быў быццам назіральнік ад Фонду Міру, а другі – ад беларускага Таварыства Чырвонага Крыжу. Але, з таго, як яны па-сяброўску размаўлялі паміж сабой, было зразумела, што перада мною нейкія тэхнічныя спэцыялісты з адпаведных ворганаў, якія назіралі не за камісіяй, а за мной, і млява лічылі выбарцаў, каб замаскіравацца. Ад Фрунзенскага райвыканкама “смотрящей”, прабачце адказнай, пад выглядам назіральніцы ад беларускага Саюзу Жанчын была даволі прыемная з выгляду паненка зь лёгкім дэфэктам мовы на літару “Л” (праўда яна ня ведала, хто старшыня іхнай грамадзкай арганізацыі). Затое гр-на Козела з райвыканкаму (гэта галоўны “смотрящий” па раёне) яна цудоўна ведала. Убачыўшы яго, яна ўскочыла і скіравалася за ім. Козел жа не аддаў пасунуўся да яе, а, нібы захоўваючы канспірацыю, пракрочыў далей па калідоры, рэзка спыніўся, паклікаў паненку і даў нейкія інструкцыі. Затое гэтая жанчынка так павіталася з начальнікам каленіі, які прыйшоў з праверкай, што мне падалося, што гэта яе бацька.

Перад падлікам галасоў да нас дадаліся яшчэ два назіральнікі з каленіі, якія былі запісаныя як рэпрэзэнтанты нейкага Фонду.

Заўвагі падчас назіраньня.

Паводле маіх падлікаў, па ўчастку прыйшло і прагаласавала 640-650 чалавек. У хлопцаў ад Крыжу і Міру – дзесьці 620-630 (яны мне так сказалі).

Старшыня камісіі адмовіўся сказаць колькі прагаласавала датэрмінова, колькі чалавек падалі заявы, каб прагаласаваць дома, колькі ўсяго выбарцаў на гэтым участку.

Падчас падліку галасоў я амаль ня бачыў, як складаюць стосы бюлетэняў з вынікамі выбараў. Падліковы стол стаяў мэтраў 4 ад мяне. Стосы ж бюлетэняў насілі яшчэ далей мэтры на 2. Там сядзела намесьніца старшыні і нешта пісала, не гледзячы на бюлетэні, якія ўкладаліся за суседнім сталом . Шараговы сябра камісіі падыходзіў да намесьніцы ды на вуха ёй нешта казаў.

Але аднойчы, каб стварыць бачнасьць дэмакратыі адна з сябраў камісіі паказала некалькі, на яе думку спрэчных бюлетэняў. Калі адзін такі бюлетэнь усе назіральнікі палічылі “за ЛАГВІНЦА”, я ДАКЛАДНА ўбачыў у які стос яго паклалі.


Гэта быў стос ня меншы за 50-60 бюлетэняў і толькі ў АДНАГО з сяброў камісіі і толькі з АДНОЙ з ТРОХ скрыняў для галасаваньня. Я агучыў сваё назіраньні камісіі, але яны маўчалі. Цікава, што пасьля гэты стос разьдзялілі на 3 часткі і панесьлі да далёкага сталу, выніковыя ж стосы фармавалі для выгляду.

Яшчэ падчас галасаваньня адна хударлявая кабеціна ў капялюшы, падобная на пэрсанаж вядомага мультфільма, разы 3 нахабна падыходзіла да розных сяброў камісіі і пераглядала сьпісы выбарцаў. Калі я не вытрымаў і ўзьняў гвалт, уся хеўра камісіі са сваімі назіральнікамі кінуліся да мяне спрачацца. Але пасьля жорсткага тлумачэньня законаў падціснулі хвасты. Высьвятлілася, што гэта камэндантка інтэрнату, што па Шаранговіча, 56, складае сьпісы тых, хто не прагаласаваў. “Зь мяне патрабуюць зводку” - наіўна прызналася яна.

Наконт “падліку”... Хацелася б добра запомніць для нашчадкаў прозьвішча намесьніцы старшыні камісіі – матэматык з гэтай школы – ЯНА цудоўна ведае сапраўдныя вынікі выбараў.

А старшыня камісіі толькі падпісаў, не спраўджваючы складзены намесьніцаю пратакол.

І. Х.



Празрыстасьць пры падліку бюлетэняў” (больш дакладна гл. www.lahviniec.org).